УДК 94:32(456.31):271.4-9(476-15)"192/193"

**С. Ф. Верамееў**
Гомельскі дзяржаўны
ўніверсітэт імя Францыска Скарыны

# УНІЯЦКАЯ ЦАРКВА Ў ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў 20–30-Я ГАДЫ ХХ СТАГОДДЗЯ І ПАЛІТЫКА ВАТЫКАНА

*У дадзеным артыкуле на падставе даступных аўтару для вывучэння навуковых прац і апублікаваных гістарычных крыніц зроблена спроба паказаць ролю Ватыкана ў працэсе адраджэння ўніяцкай царквы на прасторах Заходняй Беларусі ў міжваенны час і вызначыць асноўныя кірункі палітыкі Святога Пасаду ў адносінах да ўніі.*

Рыжская мірная дамова 1921 г., юрыдычна замацаваўшая ўключэнне Заходняй Беларусі ў склад адроджанай польскай дзяржавы, прывяла таксама да сур'ёзных змен у канфесійнай структуры грамадства. У новых умовах з'явіліся магчымасці для адраджэння ў межах II Рэчы Паспалітай уніяцкай царквы, структуры якой былі ліквідаваныя расійскім урадам у 1839 і 1875 гг.

З аднаго боку, уніяцкія традыцыі і звычаі ў пэўнай ступені захоўваліся сярод мясцовага насельніцтва, асабліва на Холмшчыне і Падляшшы. Да гэтай традыцыі жадала вярнуцца частка праваслаўных – нашчадкаў былых уніятаў, у тым ліку і на тэрыторыі Віленскай рыма-каталіцкай дыяцэзіі, якая ахоплівала значную частку заходнебеларускіх земляў. Аб дадзеных настроях вернікаў мясцовы біскуп Ю. Матулевіч інфармаваў Ватыкан у 1919 г. [1, с. 181]. З другога боку, дасягненне адзінства с праваслаўным Усходам з'яўлялася адной з галоўных мэт Рымскай курыі. Дзеля таго, каб лепш зразумець, чым была абумоўлена дадзеная мэта, трэба звярнуцца да тагачаснай каталіцкай экклезіялогіі (вучэння аб царкве).

Пасля Трыдэнцкага сабора 1545–1563 гг. у Каталіцкай царкве паступова замацавалася перакананне, што толькі яна з'яўляецца сапраўднай царквой Хрыстовай, а ўсе іншыя хрысціянскія абшчыны і групы, якія знаходзяцца па-за межамі пастырскай кампетэнцыі Папы Рымскага як намесніка святога Пятра і бачнага прадстаўніка Ісуса Хрыста – гэта супольнасці схізматыкаў (раскольнікаў) ці ерэтыкоў. Праваслаўных адносілі да ліку схізматыкаў, а іх духоўная іерархія і таінства лічыліся нелегітымнымі. Адсюль вынікала неабходнасць вяртання вернікаў гэтых супольнасцей, дзеля выратавання іх душаў, да еднасці з адзіна сапраўднай царквой на чале з Папай. Згодна тагачаснаму каталіцкаму вучэнню, вярнуцца ва ўлонне царквы яны маглі толькі праз унію са Святым Пасадам [2, с. 195]. Таму рымскія пантыфікі прыкладалі вялікія намаганні для заключэння ўніі з усходнімі хрысціянамі і ніколі не адмаўляліся ад гэтай мэты. Толькі ў сярэдзіне ХХ ст. II Ватыканскі сабор Каталіцкай царквы зноў вярнуўся да больш старажытнай, датрыдэнцкай экклезіялогіі і прызнаў усходнія (праваслаўныя) цэрквы цэрквамі ў сапраўдным і поўным сэнсе гэтага слова. Адпаведна, знікла неабходнасць у уніях з імі. Аднак у разглядаемы намі перыяд яшчэ лічылі інакш, чым і тлумачацца ўнійныя ініцыятывы каталікоў.

Падзенне манархіі ў Расіі ў 1917 г. было ўспрынята ў Ватыкане як магчымасць пашырэння місіі сярод усходніх хрысціян. Аб вялікім значэнні, якое надавалася Святым Пасадам хрысціянскаму Усходу ў тыя часы, сведчыць наступнае. 1 мая 1917 г. была створана асобная Кангрэгацыя Усходняй царквы, якую ўзначаліў сам Папа. Яна павінна была займацца ўнійнай дзейнасцю на тэрыторыі славянскага і грэка-арабскага праваслаўя. У кастрычніку 1917 г. у Рыме быў створаны Папскі Усходні інстытут для падрыхтоўкі місіянераў для працы сярод усходніх хрысціянаў [3; 4, с. 45–46].

Актуальным з'яўлялася пытанне аб шляхах і метадах дзейнасці Каталіцкай царквы па аднаўленню адзінства з праваслаўнай царквой. Па гэтаму пытанню існавала некалькі альтэрнатыўных канцэпцый. Адна з іх заключалася ў тым, каб вяртаць праваслаўных у



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

лацінскі абрад. Хаця Святы Пасад яшчэ з часоў Берасцейскай уніі нязменна адстойваў неабходнасць захавання праваслаўнымі, што далучаліся да Каталіцкай царквы, усходняга абраду, аднак у постберасцейскі перыяд на практыцы гэта не заўсёды выконвалася і перманентна былыя праваслаўныя на беларускіх і ўкраінскіх землях станавіліся каталікамі лацінскага абраду. Акрамя таго, быў распаўсюджаны погляд аб дасканаласці апошняга і перавазе яго над іншымі царкоўнымі абрадамі, асабліва ўсходнім. Місіянерская дзейнасць па вяртанню праваслаўных у рыма-каталіцызм пачалася ў 1918 г., перш за ўсё ў Люблінскай, Падляшскай і польскай частцы Сейненскай дыяцэзій, аднак не мела вялікага поспеху. Адной з прычынаў было захаванне моцных традыцый уніяцтва, асабліва на Падляшшы і Холмшчыне. Супраць лацінізацыі праваслаўных выступала і Кангрэгацыя Усходняй царквы.

Мітрапаліт Эдвард фон дэр Ропп, а таксама мінскі (потым пінскі) біскуп З. Лазінскі былі прыхільнікамі канцэпцыі бірытуалізму (двухабраднасці). Сутнасць яе заключалася ў тым, каб каталіцкія святары і біскупы мелі правы служыць у двух абрадах: лацінскім і ўсходнім. Гэтая канцэпцыя выклікала вялікую зацікаўленасць з боку ватыканскіх экспертаў, яе абмяркоўваў з падляшскім біскупам Г. Пшэздзецкім апостальскі візітатар у Варшаве А. Рацці (у будучым Папа Пій XI), аднак у выніку яна не атрымала адабрэння Святога Пасаду. Адмоўнае стаўленне Ватыкана тлумачылася бояззю ўзнікнення канфліктаў на нацыяльнай глебе, арганізацыйнымі цяжкасцямі, непрыязнасцю праваслаўнага духавенства [4, с. 216–217].

У міжваенны перыяд не існавала магчымасці для заключэння новай уніі з вышэйшымі іерархамі праваслаўнай царквы па прыкладу Берасцейскай. Каталіцкі публіцыст езуіт Я. Урбан пісаў аб нежаданні праваслаўных пастыраў еднасці з Каталіцкай царквой, іх варожасці да самой гэтай ідэі. Але Ватыкан не пакідаў спробаў дасягнуць пагаднення з імі ў гэтым кірунку. Вядома, што ў студзені 1938 г. біскуп Ф. Бучыс вёў размову аб уніі з праваслаўным мітрапалітам Елеўферыям Богаяўленскім ў Коўне, але беспаспяхова [5, с. 62].

Сваю праграму ўнійнай дзейнасці сярод праваслаўных прапаноўваў мітрапаліт граф Андрэй Шэптыцкі, які стаяў на чале грэка-каталіцкай Галіцка-Львоўскай мітраполіі ў 1901–1944 гг. Ён быў перакананы ў неабходнасці адраджэння ўніі на ўкраінскіх і беларускіх землях і далучэння да яе праваслаўных вернікаў Расіі. А. Шэптыцкі верыў у асаблівую ролю грэка-каталіцкай царквы і ўкраінскага народа ў справе вяртання адзінства з праваслаўным Усходам [4, с. 95–97].

Яшчэ ў лютым 1908 г. Папа Пій X надзяліў А. Шэптыцкага правамі і годнасцю былых кіеўскіх мітрапалітаў, а таксама прызначыў яго адміністратарам усіх епархій Рускай уніяцкай царквы, ліквідаваных царскім урадам у 1795, 1839 і 1875 гг. Гэтыя паўнамоцтвы А. Шэптыцкага неаднаразова пацвярджаліся (у 1908,1909, 1910, 1914, 1921 гг.) [6, с. 232; 4, с. 97, 103]. У пачатку XX ст. львоўскі мітрапаліт усталяваў кантакты з беларускімі нацыянальнымі дзеячамі, прыкладаў намаганні па адраджэнню ўніі на Беларусі [4, с. 98; 5, с. 26–32]. Яго заслугай з'яўляецца стварэнне першага ў гісторыі Расіі каталіцкага экзархату ўсходняга абраду ў 1917 г. [4, с. 100].

А. Шэптыцкі меў моцныя пазіцыі ў Ватыкане, у тым ліку ў Кангрэгацыі Усходняй царквы. Сам Папа Бенедыкт XV лічыў уніяцкія абшчыны на тэрыторыі Украіны фарпостамі Каталіцкай царквы, з якіх трэба было распачаць барацьбу за царкоўную еднасць з Усходам. Але місіянерская актыўнасць А. Шэптыцкага – не толькі шчырага хрысціяніна, але і вялікага патрыёта Украіны, звязанага з нацыянальным рухам, выклікала занепакоенасць польскага боку, які бачыў у ёй пагрозу ўзмацнення ўкраінскіх нацыянальных памкненняў. Пазіцыя палякаў знаходзіла паразуменне ў часткі вышэйшых саноўнікаў Рымскай курыі, сярод якіх былі прэфект Кангрэгацыі распаўсюджвання веры, некаторыя прадстаўнікі Дзяржаўнага Сэкрэтарыяту, а таксама генерал Ордэна езуітаў Ул. Ледахоўскі [4, с. 46–47].

У Ватыкане разумелі, што далейшая актывізацыя ўкраінскіх грэка-каталікоў па распаўсюджванні ўніі на тэрыторыі польскай дзяржавы будзе суправаджацца ўзрастаннем процідзеяння ёй з боку польскіх уладаў і біскупаў, і не былі зацікаўлены ў экскалацыі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

канфлікту, асабліва сярод духоўнай іерархіі. Акрамя таго, усходні абрад, які практыкаваўся ў Галіцка-Львоўскай мітраполіі (у афіцыйных дакументах Ватыкана ён называўся “Ritus Greco-Rutenus» – грэка-русінскі абрад), адрозніваўся ад усходняга (так званага сінадальнага) абраду, якога прытрымлівалася Расійская праваслаўная царква, у тым ліку на тэрыторыі Беларусі і Украіны. Наяўнасць шэрагу лацінскіх элементаў (напрыклад, па знешнім выглядзе грэка-каталіцкія святары вельмі адрозніваліся ад праваслаўных) у абрадзе ўкраінскіх грэка-каталікоў магла адштурхнуць патэнцыяльных канвертытаў з праваслаўя, у той жа час як сінадальны абрад уяўляўся больш прывабным для рэалізацыі ўнійных планаў. Разумеў апошняе і А. Шэптыцкі, таму выступаў за ачышчэнне ўсходняга абраду ў Галіцка-Львоўскай мітраполіі ад лацінскіх уплываў і запазычанняў [4, с. 76].

Адраджэнне незалежнай польскай дзяржавы, якая разглядалася Ватыканам як апірышча каталіцызму ў Цэнтральна-Усходняй Еўропе, патэнцыйна паслабляла пазіцыі А. Шэптыцкага ў пытанні аб уніі. У выніку Святы Пасад у 1919 г. прыняў рашэнне, якое ў пэўнай ступені можна лічыць кампрамісным. На тых тэрыторыях, дзе не было грэка-каталіцкіх біскупаў (па-за межамі Галіцка-Львоўскай мітраполіі) вернікі ўсходняга абраду былі перададзены ў юрысдыкцыю мясцовых ардынарыяў лацінскага абраду, якія, аднак, павінны былі задавальняць рэлігійныя патрэбы ўніятаў habita ratione cultus et linguae eorum (у іх абрадзе і мове) [4, с. 217]. Гэта рашэнне азначала, што юрыдыкцыя і пастырская апека А. Шэптыцкага і яго святароў зводзілася да межаў Усходняй Галіцыі. Польскія ўлады былі задаволены такім станам рэчаў [5, с. 35].

Аднак місіянерскія ініцыятывы Каталіцкай царквы ў адносінах да праваслаўных на тэрыторыі Беларусі, Украіны, Польшчы і Расіі на гэтым не спыніліся. Яны атрымалі новы імпульс пасля абрання ў лютым 1922 г. Папай Рымскім Ахілле Рацці, які прыняў імя Пій XI. Як і яго папярэднікі на пасадзе св. Пятра, ён надаваў вялікую ўвагу ўнійнай дзейнасці сярод праваслаўных. Тым болей, што і сам ён раней быў заангажаваны ў гэты працэс, як намі ўжо адзначалася вышэй. У лістападзе 1923 г. з нагоды гадавіны пакутніцкай смерці св. Язафата Кунцэвіча Пій XI звярнуўся да Каталіцкай царквы з энцыклікай “*Ecclesiam Dei*” (“Царква Божая”) [7], у якой адзначыў неабходнасць пераадолення недаверу і антыпатыі паміж каталікамі і праваслаўнымі, пошуку шляхоў узаемаразумення і дыялогу паміж імі, а таксама падкрэсліў асаблівую ролю ўніяцкіх цэркваў. У Каталіцкай царкве ўзрасла ўвага да праваслаўнага Усходу, місіялогія стала навучальным прадметам у семінарыях, у Рыме быў адчынены Місіялагічны інстытут, а ў Папскім Грыгарыянскім універсітэце з’явіўся місіялагічны факультэт [4, с. 68].

Менавіта падчас пантыфікату Пія XI пачалося адраджэнне ўніяцкай царквы на тэрыторыі Заходняй Беларусі, Падляшша і Валыні, якое вядомае ў гістарыяграфіі як неаўнія.

У кастрычніку 1923 г. сваю праграму ўнійнай дзейнасці прадставіў Папе падляшскі біскуп Г. Пшэздзецкі. Яна прадугледжвала аднаўленне ці арганізацыю на тэрыторыі Падляшскай дыяцэзіі ўніяцкіх парафій, у якіх практыкаваўся б усходні абрад і якія былі б падначалены мясцоваму рыма-каталіцкаму епіскапу, г. зн. самому Г. Пшэздзецкаму. Дадзеная праграма была ўхвалена Піем XI, а ўжо 10 снежня 1923 г. Г. Пшэздзецкі атрымаў ад Кангрэгацыі Усходняй царквы інструкцыі Zelum Amplitudinis аб вядзенні місійнай працы сярод праваслаўных на тэрыторыі Падляшскай дыяцэзіі. Інструкцыі забаранялі ўводзіць змены ў усходні абрад, якія б парушалі яго чысціню. Прыкладна праз месяц – 21 студзеня 1924 г. Г. Пшэздзецкі атрымаў ад Папы дэкрэт і паўнамоцтвы на ўнійную дзейнасць ва ўсходнім абрадзе на тэрыторыі Падляшскай дыяцэзіі [4, с. 222–223]. Гэтую дату можна лічыць афіцыйным пачаткам неаўніі.

4 красавіка 1925 г. Апостальская нунцыятура ў Варшаве сваім дэкрэтам надала правы на арганізацыю ўнійных парафій віленскаму арцыбіскупу, пінскаму, луцкаму і люблінскаму біскупам [4, с. 228]. Такім чынам, унійная акцыя была пашырана на іншыя дыяцэзіі на тэрыторыі тагачаснай польскай дзяржавы.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Усходні абрад, які прапаноўвала Каталіцкая царква (ў афіцыйных дакументах Ватыкана ён называўся візантыйска-славянскім), у асноўным быў адпаведны сінадальнаму абраду ў РПЦ, за выключэннем малітвы за Папу і мясцовага біскупа на літургіі, і забароны разводаў. Праваслаўны аўтар К. Мікалаеў адзначаў, што набажэнствы ў уніяцкіх цэрквах адбываліся строга па Тіпікону, а часам больш правільна, чым у праваслаўных цэрквах [5, с. 68]. Паступова ў візантыйска-славянскі абрад пачалі пранікаць некаторыя лацінскія элементы, напрыклад, набажэнствы, прысвечаныя Сэрцу Ісуса [5, с. 69], аднак гэтыя рэцэпцыі не набылі вялікага маштабу.

Асобна адзначым, што ў міжваенны час Ватыкан прыклаў вялікія намаганні па вырашэнню кананічных пытанняў праваслаўя. Справа ў тым, што ў праваслаўнай царкве не было і да сённяшняга часу не існуе адзінага кодэксу канонаў, таму незразумела, якія з іх павінны дзейнічаць, а якія не. Дзеля вырашэння гэтага пытання ў 1929 г. Святы Пасад стварыў Камісію па кадыфікацыі ўсходняга права, якая на працягу 1930–1934 гг. выдала 13 тамоў крыніцаў [5, с. 72–73], аднак кодэкс у той час так і не быў падрыхтаваны і ўбачыў свет толькі ў 1990 г.

У справе рэалізацыі ўнійных планаў Святы Пасад вялікую ролю адводзіў езуітам. Мітрапаліт А. Шэптыцкі і біскуп Г. Пшэздзецкі выступалі за ўтварэнне іх усходняй галіны, якая ўзнікла ў пачатку 1920-х гг. Місіянеры, што вучыліся ў езуітскіх калегіях, у будучым павінны былі пачаць працу сярод праваслаўнага насельніцтва Расіі. Генерал Ордэну езуітаў Ул. Ледахоўскі, звяртаючыся да іх, казаў: “*Вы з’яўляецеся фундаментам таго гмаху, які хоча пабудаваць Таварыства на карысць хвалы Божай на Усходзе*” [4, с. 239]. Езуіцкі кляштар у Альбертыне каля Слоніма, заснаваны ў верасні 1924 г., стаў адным з галоўных цэнтраў неаўніі на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Са згоды Папы таксама былі ўтвораны ўсходнія адгалінаванні капуцынаў, аблатаў, рэдэмптарыстаў, якія дзейнічалі ў міжваенны час на заходнебеларускіх землях [5, с. 121].

У 1925 г. паміж Ватыканам і ўрадам Рэчы Паспалітай быў заключаны канкардат. Усходні абрад ў ім не ўзгадваўся. Як піша М. Мруз, пытанне аб ім нават не з’яўлялася прадметам папярэдніх перамоў польскага боку з Ватыканам. У польскай гістарыяграфіі дадзеная акалічнасць тлумачыцца слабасцю ўнійнага руху, яго сціплай царкоўнай базай, а таксама тым, што ён знаходзіўся яшчэ ў стане фарміравання. Выказваліся гіпотэзы, што польскі ўрад імкнуўся захаваць такім спосабам для сябе свабоду для манеўра адносна ўніі, ці што была заключана вусная дамова са Святым Пасадам аб легалізацыі ўніяцкіх абшчын. Але адсутнасць узгадкі пра ўсходні абрад у канкардаце не азначала, што ён не меў юрыдычных падставаў для існавання. Ужо ў першым артыкуле канкардата адзначалася, што “*Рымска-Каталіцкая царква, нягледзячы <u>на розніцу яе абрадаў</u>* (падкрэслена мной – Аўт.), *у Рэчы Паспалітай будзе карыстацца поўнай свабодай*” [4, с. 269]. Такім чынам, прызнавалася, што можа існаваць некалькі абрадаў і ўсе яны роўныя паміж сабой. Дзевяты артыкул дазваляў змены ў адміністрацыйнай структуры Каталіцкай царквы са згоды ўрада, што азначала магчымасць утварэння ў будучым асобнай іерархіі для ўніятаў [4, с. 270]. Разам з тым, Ватыкан пайшоў на значныя саступкі палякам адносна Галіцка-Львоўскай мітраполіі. Канкардат дэ-факта зводзіў паўнамоцтвы А. Шэптыцкага да абшару трох паўднёва-ўсходніх ваяводстваў Рэчы Паспалітай і рабіў немагчымым місіянерскую дзейнасць падначаленага яму грэка-каталіцкага духавенства сярод украінскага насельніцтва на Падляшшы, Валыні, Холмшчыне. Львоўскі мітрапаліт імкнуўся аспрэчыць канкардат, які абмяжоўваў яго самастойнасць [5, с. 37], але беспаспяхова. Аднак дэ-факта Шэптыцкі аказваў істотны ўплыў на развіццё неаўніі на тэрыторыі Заходняй Беларусі на ўсім працягу міжваеннага перыяду [5, с. 43–57].

Неаўнія разглядалася Святым Пасадам як падрыхтоўчы этап перад пачаткам місіянерскай працы ў Расіі. У 1925 г. у структуры Кангрэгацыі для Усходняй царквы была створана Папская камісія Pro Russia (Для Расіі; поўная назва: Pontificia Commissione Pro Russia). Яна павінна была займацца справамі каталікоў усіх абрадаў у Расіі, духоўнай апекай



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

расійскай эміграцыі, а таксама місійнай дзейнасцю ў суседніх з Расіяй краінах, у тым ліку ў Польшчы. Камісію Pro Russia ўзначаліў Мішэль Д'Эрбіньі [8], які з'яўляўся ў той час галоўным архітэктарам унійных планаў Ватыкана адносна праваслаўнага Усходу. Адзначым, што ён не лічыў беларусаў і ўкраінцаў самастойнымі народамі, але часткамі рускага народу. Русафільскія і антыпольскія настроі панавалі і сярод супрацоўнікаў Камісіі Pro Russia [4, с. 100]. Таму невыпадкова, што спачатку ўнійная дзейнасць праводзілася галоўным чынам на рускай мове, а некаторыя беларускія святары (Ф. Абрантовіч, Я. Германовіч і інш.), якія жадалі працаваць сярод свайго народа, былі накіраваны ў Харбін для пастырскай працы сярод расійскай эміграцыі [9, с. 17].

6 красавіка 1930 г. камісія Pro Russia была выведзена з Кангрэгацыі для Усходняй царквы і пераўтворана ў асобную арганізацыю, падначаленую непасрэдна Папе. Разам з узвышэннем статусу ёй былі перададзеныя некаторыя функцыі, якія раней здзяйснялі польскія біскупы лацінскага абраду ў адносінах да ўніятаў на тэрыторыі Рэчы Паспалітай. У тым жа 1930 г. епіскапам усходняга абраду з правамі персанальнай юрысдыкцыі і шырокімі паўнамоцтвамі быў прызначаны Францішак Бучыс, прыняўшы імя Пётр, літовец па нацыянальнасці. У 1931 г. Пій XI прызначыў апостальскім візітатарам у Польшчы ўкраінца Мікалая Чарнецкага з ордэну рэдэмптарыстаў. Але ён не атрымаў права юрысдыкцыі над вернікамі ўсходняга абраду, якія па ранейшаму заставаліся ў лацінскіх біскупаў. Апошнія павінны былі ўтварыць пасаду генеральнага вікарыя альбо спецыяльнага чыноўніка па справах візантыйска-славянскага абраду [4, с. 271].

Святы Пасад разглядаў магчымасць утварэння асобнай іерархічнай структуры для неаўніі. Такі варыянт развіцця падзеяў ствараў пагрозу рэалізацыі польскай палітыкі ў нацыянальным пытанні і, адпаведна, незадавальняў палякаў [5, с. 65]. Апошнія бачылі таксама русафільскія настроі ў Камісіі Pro Russia і не маглі дапусціць русіфікацыі беларусаў праз Ватыкан [9, с. 12]. Урад Польшчы – дзяржавы, абсалютная большасць насельніцтва якой было каталікамі, не мог уступаць у адкрытую канфрантацыю са Святым Пасадам. Аднак быў прыняты шэраг мер, накіраваных на абмежаванне распаўсюджвання неаўніі. У 1932 г. польскі ўрад адмовіўся даваць Ф. Бучысу візу на ўезд у Польшчу. Ватыкан пайшоў на саступкі, даручыўшы Ф. Бучысу духоўную апеку над расійскай эміграцыяй. На працягу 1930–1939 гг. польскі ўрад блакаваў спробы Ватыкана па стварэнні асобнай епархіі з цэнтрам у Ковелі для каталікоў візантыйска-славянскага абраду [5, с. 98-99].

У пачатку 1930-х гг. істотныя змены па ўніяцкаму пытанню адбыліся ў самім Ватыкане. Біскуп М. Д'Эрбіньі фактычна быў адхілены ад каардынацыі місійнай дзейнасці сярод праваслаўных, а Камісія Pro Russia страціла свой ранейшы статус і была пераўтворана ў адзін з дэпартаментаў Дзяржаўнага Сэкрэтарыяту. Усе пытанні, звязаныя з уніятамі, у тым ліку ў Заходняй Беларусі, перадаваліся ў кампетэнцыю Кангрэгацыі Усходняй царквы [9, с. 24]. Абставіны і акалічнасці гэтых змен патрабуюць асобнага даследавання. Аднак, безумоўна, нягледзячы на адміністрацыйныя пераўтварэнні, дасягненне адзінства з праваслаўным Усходам па-ранейшаму захоўвала выключную значнасць для Святога Пасаду. Адзначым таксама, што ў 1930-я гг. русафільскія тэндэнцыі ў унійнай дзейнасці пачалі змяншацца, адначасова ўзрастала выкарыстанне беларускай і ўкраінскай моў [5, с. 81].

Пачатак Другой сусветнай вайны прывёў да кардынальных змен у палажэнні і статусе ўніяцкіх парафій у Заходняй Беларусі. У новых геапалітычных умовах мітрапаліт А. Шэптыцкі, карыстаючыся сваімі паўнамоцтвамі, атрыманымі ад Пія Х, стварыў чатыры ўніяцкіх (грэка-каталіцкіх) экзархаты на тэрыторыі былой польскай дзяржавы, у тым ліку і Беларускі экзархат. Кіраўніком апошняга (экзархам) спачатку быў прызначаны М. Чарнецкі, а праз год – у снежні 1940 г. – яго змяніў святар-езуіт А. Неманцэвіч [10]. Рашэнні аб стварэнні Беларускага экзархату і прызначэнні А. Неманцэвіча былі афіцыйна зацверджаны Святым Пасадам. У выніку ўзнікла асобная арганізацыйная структура для ўніяцкіх парафій на тэрыторыі Заходняй Беларусі, што азначала ўпарадкаванне царкоўнага жыцця. У савецкіх умовах легальнае функцыянаванне экзархату аказалася фактычна немагчымым, яго



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

дзейнасць легалізавалася толькі падчас нямецкай акупацыі. Але ў 1942 г. А. Неманцэвіч быў арыштаваны нямецкімі акупантамі і памёр у мінскай турме СД у пачатку студзеня 1943 г. [11, с. 154–155], а далейшая дзейнасць экзархату немцамі была паралізавана [12, с. 143]. Аднак з пункту гледжання кананічнага права Каталіцкай царквы Беларускі экзархат як асобная адміністрацыйная царкоўная адзінка не спыніў свайго існавання дэ-юрэ да сённяшняга часу (адпаведных рашэнняў Ватыкан ніколі не прымаў) і працягвае існаваць у статусе Sede Vacante (“вакантны пасад”, г. зн. структура без кіраўніка).

**Крыніцы і літаратура**


1. Stolica Apostolska a biskup Jerzy Matulewicz 1916-1921 / tł. i do dr. przygot.: ks. Jan Bukowicz MIC, Tadeusz Górski MIC. – Warszawa : Wydaw. Księży Marianów, 1996. – 327 s.
2. Суттнер, Э. Христианство Востока и Запада в поисках зримого проявления единства / Э. Суттнер / пер. О. Величко. – М.: Библейско-Богословский институт св. апостола Андрея, 1999. – 313 с.
3. Congregation for the Oriental Churches. – Rome, 2017. – 48 p.
4. Мруз, М. Каталіцызм на пагранiччы. Адносіны каталіцкай царквы да ўкраінскага і беларускага пытання ў Польшчы ў 1918-1925 гг. / М. Мруз / пер. с польск. – Мінск: Медысонт, 2009. – 304 с.
5. Свирид, А. Н. Униатская церковь в Западной Беларуси (1921–1939 гг.) / А.Н. Свирид. – Брест: БрГУ им. А.С. Пушкина, 2012. – 218 с.
6. Назарко, І. Київскі і Галицькі Митрополити. Біографічні нариси (1590-1960) / І. Назарко. – Рим: б/и, 1962. – 272 с.
7. Pio XI. Enciclica “Ecclesiam Dei”. [Электронный ресурс] – Режим доступа : http://www.vatican.va/content/piusxi/it/encyclicals/documents/hf_pxi_enc_19231112_ecclesiam-dei.html. – Дата доступа : 20. 12. 2020.
8. Мишель-Жозеф Д’Эрбиньи. [Электронный ресурс] – Режим доступа : http://yakov.works/spravki/1_history_bio/19_1890/1880_Erbinyi.htm. – Дата доступа : 22. 10. 2020.
9. Надсан, А. Біскуп Чэслаў Сіповіч: сьвятар і беларус / А. Надсан. – Менск: БелФранс, 2004. – 300 с.
10. Лист УГК Екзархів до секретаря Східної конгрегації Євгена Тіссерана про рішення розпочати унійну працю на території Радянського Союзу // Митрополит Андрей Шептицький. Церква і церковна єдність: документи і матеріали, 1899–1944. –Львів: Свічадо, 1995. – Т. І. – С. 357.
11. Гаек, С. Экзарх Антон Неманцэвіч – верны сьведка Евангельля. Колькі слоў пра ягонае духоўнае служэнне / архім. С. Гаек, дыякан Я. Усошын // Roczniki Teologiczne. Tom LIII-LIV, zeszyt 7 – 2006–2007. – С. 153–163.
12. Гарошка, Л. Праз навальніцы й нягоды. Успаміны з гадоў 1930-1944. Фрагмэнты / айцец Л. Гарошка // Беларуская мемуарыстыка на эміграцыі. – Нью-Ёрк, 1999. – С. 135–144.


РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ